УДК 378.147

**У. А. ГАНЧАР**
(УА «Гомельскі дзяржаўны
ўніверсітэт імя Ф. Скарыны»)

# РАБОТА З КРЫНІЦАМІ І ЛІТАРАТУРАЙ У ПРАЦЭСЕ ВЫКЛАДАННЯ ГІСТОРЫІ РЭЛІГІЙ

*У артыкуле разглядаецца выкарыстанне крыніц і літаратуры ў працэсе выкладання курса «Гісторыя рэлігіі». Паказваюцца неабходнасць выкарыстання крыніц і літаратуры ў працэсе выкладання «Гісторыі рэлігіі», выдзяляюцца найбольш важныя тыпы крыніц, неабходныя падчас выкладання курса, аналізуюцца спосабы іх выкарыстання для лекцыйных і практычных заняткаў, самастойнай работы студэнтаў. Робіцца выснова аб неабходнасці фарміравання ў студэнтаў умення аналіза крыніц, верыфікацыі матэрыялаў.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Гісторыя рэлігій з’яўляецца адным з базавых прадметаў у працэсе падрыхтоўкі студэнта-гісторыка. Улічваючы выключную ролю рэлігіі ў працэсе развіцця чалавечага грамадства, разуменне студэнтамі гістарычнага факультэта умоў і прычын зараджэння рэлігіі, развіцця рэлігійных вераванняў, рэлігійнага фактара ў чалавечай гісторыі робіць гэтую дысцыпліну адной з важнейшых у вучэбным працэсе. Улічваючы разнастайнасць такой з’явы як рэлігія, шматстайнасці рэлігійных сістэм лагічным з’яўляецца выкарыстанне ў вучэбным працэсе шырокага кола крыніц і дадактовай літаратуры [1; 2; 3; 4].

Што тычыцца крыніц, то асноўную ролю ў працэсе выкладання гісторыі рэлігій, на нашую думку, адыгрываюць такія іх тыпы, як пісьмовыя крыніцы, а таксама фота- відэадакументы. Іх выкарыстанне мэтазгодна як падчас лекцыйных, так і практычнаых заняткаў. Напрыклад, пры выкладанні студэнтам новага матэрыялу, эфектыўным для засваення імі інфармацыі з’яўляецца суправаджэнне тэкста візуальным матэрыяламі. Гэта дазваляе аўдыторыі лепш зразумець нюансы тэмы, якія часта застаюцца незаўважанымі пры выкарыстанні толькі вербальных сродкаў. Напрыклад, пры разглядзе тэмы «Буддызм у гістарычнай эвалюцыі» выкарыстанне фота буддыйскіх храмаў, іканаграфіі розных краін, у якіх гэтая рэлігія распаўсюдзілася, дазваляе студэнтам лепш зразумець яго эвалюцыю пад уплывам лакальных традыцый, а таксама агульную эвалюцыю дадзенай канфесіі, адрозненні паміж яго плынямі. Выкарыстанне пісьмовых крыніц падчас лекцыйных заняткаў мэтазгодна для

акцэнтуалізацыі ўвагі студэнтаў на пэўных аспектах тэмы, падтрымання зваротнай сувязі з аўдыторыяй, падтрымоўванне ўвагі вучняў шляхам чаргавання выкарыстання розных педагагічных прыёмаў. Напрыклад, падчас лекцыі, прысвечанай Іудаізму, цытаванне ўрыўкаў са Старога Запавету з наступнай пастаноўкай праблемных пытанняў дазваляе актывізаваць пазнавалюную дзейнасць студэнтаў, садзейнічае выпрацоўкі ў іх даследчыцкіх навыкаў.

Выкарыстанне крыніц таксама мэтазгодна і падчас правядзення практычных заняткаў. Візуальныя крыніцы, у прыватнасці фота- і відэадакументы, могуць быць выкарыстаны студэнтамі пры падрыхтоўцы тэматыкі практычных заняткаў. Гэта, зноў-такі, дазваляе ім лепш зразумець матэрыялу. Выкарыстанне візуальных крыніц у сваіх адказах непасрэдна падчас практчынага занятку, прыцягвае значна большую ўвагу аўдыторыі у параўнанні з вербальным выкладннем матэрыялу. Выкарыстанне пісьмовых крыніц падчас практычных заняткаў дазваляе студэнтам выпрацаваць ці павысіць свае навыкі працы з крыніцамі ўвогуле, і, зноў такі, дазваляе глыбей зразумець тэму. Напрыклад, шэраг практычных заняткаў па гісторыі рэлігіі прысвечаны вывучэнню Бібліі. Таму тут безумоўна мэтазгодна выкарыстоўваць непасрэдна дадзеную кнігу. Яе разбор дазваляе студэнтам лепш «акунуцца ў эпоху», зразумець спецыфічныя нюансы вывучаемай тэмы.

Выкарыстанне літаратуры пры вывучэнні курса «Гісторыя рэлігій» апраўдана падчас практычных заняткаў, а таксама СКРС. Акрамя спіса літаратуры, які з’яўляецца рэкамендаваным пры падрыхтоўцы да практычных, можна рэкамендавац студэнтам дадатковую літаратуру пры падрыхтоўцы больш вузкіх, спецыялізаваных пытанняў.

Апошні аспект тычыцца даступнасці крыніц і літаратуры па курсу «Гісторыя рэлігій». Можна канстатаваць, што на сённяшні дзень, дзякуючы наяўнасці інтэрнэта, літаратура і пісьмовыя крыніцы (прычым не толькі на беларускай, рускай мове, але і на іншых, у тым ліку і мове арыгіналу) з’яўляюцца даступным прыктычна па кожнай тэме. Тое ж тычыцца і візуальных крыніц. Дзякуючы інтэрнэту, фактычна па кожнай тэме даступна вялікая колькасць фота- і відэаматэрыялаў, пачынаючы ад аматарскіх фотаздымкаў і сканчваючы дакументальным фільмамі з падбязным аналізам той ці іншай тэмы. Таму важным прадстаўляецца фарміраванне ў студэнтаў навыкаў адбору і верыфікацыі крыніц, якія ў іх, нажаль, прысутнічаюць часцей за ўсё на недастатковым узроўні.

Такім чынам, выкарыстанне крыніц і літаратуры пры вывучэнні курса «Гісторыя рэлігій» з’яўляецца неабходнай сладаючай



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

вывучэння дадзенага прадмета, як падчас лекцый, так і пры выкананні практычных занятка, СКРС. Наяўны на сёння доступ да крыніц і літаратуры па курсу з'яўляецца дастатковым для падрабязнага вывучэння фактычна кожнай тэмы. У гэтых умовах важным уяўляецца неабходнасць фарміравання ў студэнтаў навыкаў адбору і верыфікацыі крыніц і літаратуры, умення самастойнай працы з тэкстамі па прадмету.

### Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры


1. Корзюк А. Выкарыстанне дакументальнага матэрыялу ў працэсе навучання гісторыі // Беларускі гістарычны часопіс. 2012. № 8. С. 44–49
2. Корзюк А. Работа з вучэбным гістарычным тэкстам : асноўныя метадычныя прыёмы // Беларускі гістарычны часопіс. 2013. № 1. С. 40–47
3. Забельникова О. Использование исторических источников в учебно-воспитательном процессе // Гісторыя : праблемы выкладання. 2009. № 10. С. 58–60.
4. Паноў С. Выкарыстанне дакументальна-метадычнага комплексу пры навучанні гісторыіі Беларусі // Гісторыя : праблемы выкладання. 2010. № 6. С. 11–16.


УДК 94(367):37.034

**Т. Н. СЫМАНОВИЧ, З. С. КУРЬЯН**

(УО «Мозырский государственный
педагогический университет им. И. П. Шамякина»)

## ПРОБЛЕМА ЦЕЛЕПОЛАГАНИЯ НРАВСТВЕННОГО ВОСПИТАНИЯ ЛИЧНОСТИ В ВОСТОЧНОСЛАВЯНСКОЙ ПЕДАГОГИЧЕСКОЙ ТРАДИЦИИ X–XIII ВЕКОВ

*В статье рассматриваются вопросы определения цели духовного развития личности в педагогическом наследии восточнославянских земель X–XIII вв. Определяется их парадигмальная заданность христианской картиной мира и системой ценностей; выявляется прогностический характер воспитательных подходов мыслителей Киевской Руси для современной теории и практики нравственного воспитания.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ